# Бярозка

ISSN 0320—7579

№ 4. 1993

ВЕРШЫ:
ВАСІЛЬ ЗУЁНАК
ВЕРА МАРКАВА


## Наш Менск



# ПОЎНЯ НА БЕРАЗЕ ТЫМ


## ВЕРШЫ З КНІГІ «ПАКУЛЬ СТАІЦЬ ЗЯМЛЯ» 1964—1977

Малюнкі УЛАДЗІМІРА СКРЫГАНАВА



*Поўня на беразе тым...*
*Кінула мне канец ручніка.*
*Я пачала абмотваць ручніком*
*Чорныя абгарэлыя пні,*
*Чорныя абгарэлыя галовы...*
*Толькі мне не хапіла поўні.*
*1964 г.*

*Вось тут,*
*На беразе ракі,*
*Стаялі чараты ў баярскіх шапках...*
*Там, дзе сухое рэчышча цяпер.*
*Рака спакою.*
*1976 г.*







## ВЕРА МАРКАВА

*Вецер з-за рэчкі,*
*Нібыта голас падлетка,*
*Зрываецца на высокую ноту.*

*Гляджу:*
*Невысокі чарот*
*Зноў да маёй шчакі дацягнуўся,*
*І на вільготным мяккім пяску*
*Нага пакінула дзіцячы сълед.*

*Ён вечны,*
*Як сълед на поўні.*
*1976 г.*




*Зацягнутае плеўкай птушынае вока —*
*Неба вясны,*
*Неба надзеі.*

*І я паціху ўтаркну*
*Галінку з белай кудзеляй*
*У зямлю — вялікае гняздо.*
*1977 г.*

© «Бярозка», 1993

З рускай пераклаў АДАМ ГЛОБУС



# АДКУЛЬ ПАХОДЗЯЦЬ ЛІЛІПУТЫ?

Вядома, што слова «ліліпут» упершыню было выкарыстана ў 1726 годзе ў рамане вялікага ангельскага сатырыка Джонатана Сьвіфта «Падарожжы ў некаторыя аддаленыя краіны сьвету Лемюэля Гулівера, спачатку хірурга, а пасьля капітана некалькіх караблёў».

Некаторыя ангельскія філолагі даюць даволі верагоднае тлумачэньне узьнікненьню гэтага слова. У ангельскай дыялектычнай мове і зараз можна пачуць «lill» замест «little» (маленькі). Яго вы сустрэнеце, калі адкрыеце які-небудзь зборнік ангельскіх народных баладаў ці казак. Слова «lill» ужывалася таксама для абазначэньня шпілек маленькага памеру, яно маецца ў «оксфардскім слоўніку ангельскай мовы». Там жа можна знайсьці і другі кампанент слова «ліліпут» — таксама дыялектнае слова «put» у значэньні «некультурны вясковы хлопец». У XVIII стагодзьдзі яно шырока прымянялася ў гутарковай мове проста ў значэньні «хлопец, чалавек».

Па іншай распаўсюджанай у літаратуры версіі склад «пут» узяты Сьвіфтам ад лацінскага «піцідус» — сапсаваны. Пісьменьнік хацеў сказаць, што ў мініяцюрнай дзяржаве існуюць тыя ж заганы, што і ў сучасным яму «вялікім» грамадстве.

Цікавае паходжаньне і іншых неалагізмаў Сьвіфта. Хоць яны і не знайшлі шырокага міжнароднага распаўсюджваньня, гэтыя словы часам выкарыстоўваюцца ў англамоўнай прэсе і кнігах, разьлічаных на адукаванага чытача, які знаёмы з творчасьцю Сьвіфта. Напрыклад, слова «Brobdingnag», якое ў Сьвіфта азначае краіну веліканаў, куды Гулівер трапіў пад час свайго другога падарожжа. Яно і цяпер часам выкарыстоўваецца ў ангельскай мове, калі гаворка вядзецца пра што-небудзь надзвычай вялікае. Пры стварэньні гэтага слова Сьвіфт, відаць, сыходзіў са слова «broad» (шырокі).

Слова «Houyhnhnm» (гуінгм), якое ў рамане служыць для абазначэньня разумных і высакародных коней, напэўна, паходзіць ад ангельскага «whinny», што значыць «ржаць ціха альбо радасна».

Назва агідных чалавекападобных «йэху» («yahoo») выкарыстоўваецца ў пераносным сэнсе, і растлумачыць паходжаньне гэтага слова цяжэй. Адны лічаць, што Сьвіфт яго проста прыдумаў, другія мяркуюць, што слова, магчыма, зьвязана з назвай індзейскага племені яху, якое жыве на мяжы Бразіліі і Францускай Гвіяны, трэція схіляюцца да думкі, што гэта — словазлучэньне двух выклічнікаў: насьмешліва-пагардлівага «yah!» («ды ну! вось як!») і «hoo» («ого-го!»).

Можна таксама адзначыць, што і само імя Лемюэля Гулівера мае пэўнае значэньне. Лемюэль — старажытнаеўрапейскае імя, якое азначае «прысьвечаны Богу» і, такім чынам, «той, хто знаходзіцца пад боскай абаронай»: намёк на тое, што герой шчасьліва выходзіць са многіх небясьпечных сітуацый.

Наконт прозьвішча «Гулівер» (правільнае вымаўленьне — Гулíвер) меркаваньні разыходзяцца. На думку некаторых, гэтае слова зьвязана са старажытнаангельскім імем Вульдхерэ і азначае «воўчае войска», а ў пераносным сэнсе «адвага» — якасьць, якая ў вышэйшай ступені ўласьцівая Лемюэлю Гуліверу.

**Па матэрыялах часопіса «Наука и жизнь»**

# НАЙМЕНЬНІ, А ЦІ МЕНСКІЯ?



Г. МІНСК У 50-ЫХ ГАДАХ XIX СТ. КУТОК ВЕРХНЯГА ГОРАДА

Рэканструкцыя **ВІКТАРА СТАШЧАНЮКА**

Менск. Менавіта гэткае, спрадвечнае, а не спаланізаванае найменьне Мінск павінна мець сталіца незалежнай Рэспублікі Беларусь. Назва Мінск павінна застацца ў гісторыі, адысьці з ужытку, як адышлі недарэчныя і надуманыя, штучныя сьцяг і герб. Хтосьці можа не пагадзіцца, маўляў, што вырашае адна літара, адзін гук?! Аднак я перакананы: найменьні, з якімі сутыкаемся мы штодня, уплываюць на нашу псіхалогію і сьвядомасьць, на ўяўленьне пра сьвет і нашае месца ў ім. А мусім мы быць не жыхарамі еўраазіяцкай імперыі, якімі прымусова зьяўляліся дзьвесьце гадоў, а грамадзянамі еўрапейскай краіны, якімі былі больш за сем стагодзьдзяў.

А як жа захоўваецца, як адлюстроўваецца нашая гістарычная памяць і, як модна цяпер казаць, менталітэт, у сталічных найменьнях? Але перш чым адказаць на гэтае пытаньне, зробім невялікі экскурс у гісторыю.

Летапісны Меньск (Менеск) упершыню ўпамінаецца ў «Аповесьці мінулых гадоў» пад 1067 годам, як горад Полацкага княства. Лічыцца, што дзядзінец, старажытны цэнтр горада, узьнік на беразе Сьвіслачы пры ўпадзеньні ў яе Нямігі. Але ёсьць і версія, што старажытны горад узьнік за 16 кіламетраў на захад ад менскага замчышча, на беразе амаль высахлай

цяпер рачулкі Менкі, якая і дала назву горада.

У канцы 11 стагодзьдзя Менск стаў цэнтрам удзельнага княства, і княжыў у ім Глеб Усяслававіч. З сярэдзіны наступнага стагодзьдзя горад — адзін з буйнейшых у Полацкай зямлі, а з першай чвэрці 14 стагодзьдзя — у Вялікім Княстве Літоўскім. У 1499 годзе ён атрымаў Магдэбургскае права, а ў 1591 годзе — і герб: у блакітным полі жаночая менскіх ордэнаў: дамініканцаў, бернардзінак, бенедыктынак, францысканцаў у 17 стагодзьдзі, езуітаў, баніфратаў, кармелітаў, бенедыктынаў, марыявітак у 18 стагодзьдзі. Варта ўслухацца ў гэтыя даўнія словы. За кожным з іх, як за таўшчэзнымі мурамі, хаваюцца таямніцы і плятуцца інтрыгі, чуюцца багаслоўскія дыспуты і ўрачыстыя арганныя месы, шолах бібліятэчных мануcкрыптаў і спавядальны шэпт.



Парк імя Янкі Купалы. Здымак 50-х гадоў

постаць паміж анёламі і херувімамі.

У 15 стагодзьдзі сфарміравалася забудова Троіцкага (каля Троіцкай гары) і Ракаўскага прадмесьцяў. Пазьней да рамеснага пасада з гандлёвым пляцам — Нямігскім (Ніжнім) рынкам — дадаўся новы гандлёвы цэнтр: Верхні рынак. Тут пабудавалі Менскую ратушу, узьвялі шмат культавых, сьвецкіх і жылых будынкаў. Драўляныя манастыры з цэрквамі — Казьмадзямьянскі, Ушэсьця, Петрапаўлаўскі (у гонар апосталаў Пятра і Паўла), Сьвятадухаўскі — паступова замяняліся на мураваныя. Узводзіліся кляштары з касьцёламі

У 1793 годзе Менск трапіў у склад Расійскай імперыі. Пачалося «ўпарадкаваньне» тэрыторыі горада і яго забудовы на імперскі рэгулярны лад. Былі скапаныя гарадскія абарончыя збудаваньні, узьніклі новыя вуліцы, а старыя былі падоўжаныя. Зьявіліся і прарасейскія найменьні. Вуліца Францысканская зрабілася Губернатарскай, Феліцыянская — Багадзельнай, Дамініканская — Петрапаўлаўскай, Зборавая — Праабражэнскай. Плошчу Верхні рынак перайменавалі ў Саборную. Быў закладзены Аляксандраўскі (па імені імператара) сквер, царква Аляксандра Неўскага,



Дом масонаў

іншыя культавыя будынкі. А некаторыя, як Сьвятадухаўская царква, перайменаваная ў Петрапаўлаўскі кафедральны сабор, былі і перабудаваныя ў псеўдарускім стылі. Лёс гарадской ратушы Мікалай I увогуле вырашыў адным росчыркам пяра, і ў 1858 годзе яе зруйнавалі. Царскім уладам здавалася, што ратуша для менчукоў — гэта сімвал старадаўніх звычаяў, які нагадваў ім пра вольнасьць і Магдэбургскае права.

На пачатку 20 стагодзьдзя гарадскія межы вызначаліся слабодамі Пярэспа (паводле аднайменнай рэчкі), Камароўка, Ляхаўка, Серабранка і Кальварыя, Раманаўскім прадмесьцем і Татарскім канцом.

Сапраўдная лавіна перанайменьняў абрынулася на Менск пасьля таго, як усталявалася ў ім Савецкая ўлада. Няшчадна руйнавала яна ўсё, што хоць ускосна нагадвала пра стары лад, і прымушала менчукоў звыкацца з новымі рэаліямі. I вось вуліца Койданаўская становіцца Рэвалюцыйнай, Багадзельная — Камсамольскай, Праабражэнская — часткай вуліцы Інтэрнацыянальнай, Малая татарская — Калгаснай. Дыктатура пралетарыята несла свае ідэі і ідэалы, пасьпешліва навязвала вуліцам і плошчам імёны барацьбітоў за іх. Вуліца Падгорная стала насіць імя Карла Маркса, а Петрапаўлаўская — яго паплечніка Фрыдрыха Энгельса. Вялікая Бернардынская зрабілася вуліцай Бакуніна, Манастырская — Герцэна, Магазінная — Кірава, Шпітальная — Фрунзе. Семдзесят гадоў назвы паводле імёнаў рэвалюцыянераў і дзяржаўных савецкіх дзеячоў даваліся «ідучы насустрач шматлікім пажаданьням працоўных». Яны і цяпер адны з самых распаўсюджаных у нашай сталіцы. Але не хочацца доўжыць шэраг сьвярдловых, урыцкіх і дзяржынскіх, бо на якім-небудзь Карлу Лібкнехту можна і язык зламаць. На жаль, назвы адміністратыўных раёнаў горада таксама, у большасьці сваёй, збальшавізаваныя: Кастрычніцкі, Ленінскі, Першамайскі, Савецкі, Фрунзенскі...

Аднак дзеля справядлівасьці трэба згадаць яшчэ пра дзьве хвалі перанайменьняў. Нават пад час гітлераўскай акупацыі цэнтральныя менскія вуліцы насілі імёны Алеся Гаруна і Кастуся Каліноўскага, а неўзабаве пасьля сьмерці Сталіна пазьнікалі і назовы, якія ўслаўлялі яго.

Я жыву на вуліцы Русіянава. Якія адносіны чалавек гэты мае да Менска? Аказваецца, ураджэнец Смаленшчыны Іван Русіянаў у чэрвені 1941 года камандаваў дывізіяй, якая абараняла сталіцу ў раёне Астрашыцкага Гарадка. З пэўнай нацяжкай прымаю гэтую назву, хаця недалюбліваю вайскоўцаў дый увогуле людзей у форме. А раней жыў я на вуліцы другога вайскоўца, Валерыя Чкалава. Імя яго больш вядомае. Але якое дачыненьне мае слынны лётчык-выпрабавальнік да Менска? Якая тут прывязка? Хіба што вуліца тая ўпіраецца ў аэрапорт з дзіўнаватаю назваю «Мінск-1». Другі, буйнейшы, што ў 35 кіламетрах ад сталіцы, завецца «Мінск-2». Багатая фантазія ў нашых авіятараў! А як на мой розум, дык лепш было б назваць яго «Шэметава» ці «Пекалін» паводле навакольных вёсак або «Смалявічы» па назьве раёна, у якім

месьціцца аэрапорт. Англічанам, упэўнены, і на хвіліну не прыходзіла голаў назваць сталічныя аэрапорты не «Хітроў» і «Гэтвік», а «Лондан-1» і «Лондан-2».

Не падабаюцца мне і пранумараваныя мікраараёны. Той, хто жыве ва Уруччы, яшчэ зможа вызначыць мяжу паміж Уруччам-1 і Уруччам-2. А ці шмат дае такі падзел астатнім менчукам ці прыезджым? І ўвогуле, наколькі прыгажэй гучаць Курасоўшчына, Вясьнянка і Серабранка за Усход-2 ці Захад-4!

Пэўную ніякаватасьць выклікаюць і пранумараваныя вуліцы. Сёньня ёсьць, да прыкладу, 2-я Землямерная, але няма 1-й Землямернай. Камусьці можа спатрэбіцца 3-я Пасялковая, але дарма спадзявацьмецца ён зарыентавацца па 2-й. Самотнымі засталіся таксама 1-ы Земляробчы і 4-ы Загарадны завулкі. Можа, і звыкся хто жыць у 2-м завулку Баграціёна, але хіба вуліцы мала было для нашчадка грузінскіх князёў, які служыў расейскім царам?

Даспадобы мне даўнія менскія назвы, бо даваліся яны ў адпаведнасьці з пэўнай логікай. Адны з іх арыентуюць у геаграфіі горада, паказваюць кірунак — Лагойскі тракт, Ракаўская шаша, Старабарысаўскі тракт, Прывакзальная плошча. Лібава-Роменская вуліца ідзе ўздоўж чыгункі, што колісь мела адпаведную назву. Вуліца Няміга ляжыць у тым самым кірунку, што і летапісная рэчка. Заключана яна цяпер у падземны калектар, што і адлюстравана ў назьве вуліцы Калектарнай. Хаця ёсьць і тут выключэньні — вуліца Цэнтральная знаходзіцца далёка не ў цэнтры.

Былі дый захавалася вуліцы, што ўказваюць на разьмяшчэньне пэўных аб'ектаў. На Шпалернай і праўда стаіць шпалерная фабрыка, на Парніковай — парнікі, а на Акадэмічнай месьцяцца карпусы Акадэміі навук. Вуліца Батанічная ляжыць пры Батанічным садзе, а Аэрадромная — пры старым аэрапорце. Шкада вось толькі, што перайменавалі Друкарскую, на якой стаіць Дом друку і адна з буйнейшых у рэспубліцы друкарняў, а




Акруговы дом афіцэраў

таксама Абутковую, на якой разьмешчана абутковае аб'яднаньне «Прамень». Асабіста я нічога не маю ні супраць партыйна-дзяржаўнага дзеяча Фёдара Сурганава, ні супраць архітэктара Уладзіміра Караля. Але ранейшыя назвы падабаліся болей.

Дзякуючы фундатарам ці дойлідам атрымалі свае назвы і некаторыя менскія пабудовы. Гэта тычыцць Дома масонаў, збудаванага ў 1816 годзе масонскай ложаю «Чырвоная паходня». Менскі астрог, узьведзены ў 1825 годзе, і дагэтуль называюць Пішчалаўскім замкам па імені дойліда Пішчалы. Сюды можна аднесьці і касьцёл, які завуць у народзе Чырвоным. Фундатарамі й ініцыятарамі яго пабудовы былі слуцкі шляхціч Эдвард Вайніловіч з жонкаю Алімпіяй. На іх грошы ў 1910 годзе быў пастаўлены храм у гонар сьвятых Сымона і Алены як помнік заўчасна памерлым дзецям Вайніловічаў. Адсюль і назва — касьцёл Сымона і Алены.

**Уладзімір СІЎЧЫКАЎ**

*Заканчэньне будзе.*



# ЦАЛКАМ БЕЛАРУСКІЯ ПРАБЛЕМЫ

Шчыра прызнаюся: як скончыў школу, то ў яе больш і не заходзіў. Што ж тут зробіш, калі няма на гэта ані жаданьня, ані патрэбы. З аднакласьнікамі час ад часу сустракаюся, але толькі на нейтральнай тэрыторыі. Во радасьці было, як атрымаў атэстат, думаў, на ўсё жыцьцё са школай разьлічыўся, ды не атрымалася. Сын мой падрос, давялося весьці яго ў першы клас. А каб стрымаць дадзенае сабе некалі слова, то завёў яго не ў школу, а ў гімназію. Трэці год ён туды ходзіць і, мяркую, ужо сам сабе паціху дае абяцаньне: «Вось скончу гімназію і больш ніколі ў яе заходзіць не буду». А мо так яно і павінна быць? Праблем цяпер не паменшала, а паболела.

Вось напрыклад. Пасьля летніх вакацый дзеці прыйшлі ў клас і ледзь не ўсе напісалі ў сшытках «1 верасьня», бо з усіх правілаў граматыкі не забыліся за лета бадай што аднаго: у беларускай мове як чуецца, так і пішацца. Настаўніца павыпраўляла памылкі чырвоным і доўга тлумачыла, што «Ь» тут пісаць не трэба, як і ў словах «сЬмех», «сЬнег», «сЬлед». Хоць ён тут і чуецца, але не пішацца, бо пішацца толькі там, дзе можна вымавіць і цьвёрда і мякка, а тут — захочаш, а цьвёрда не скажаш. Як і астатнія дзеці, мой сын грунтоўна засвоіў і гэтае няпісанае правіла саўнаркомаўскай беларускай граматыкі — напісаў сабе ў дзёньнік: «прынесці албом і калку» (меліся на ўвазе альбом і калька). А ў сшытку пазьнікалі мяккія знакі ў словах «ноль» і «соль», што давяло настаўніцу да роспачы. Тлумачыў гэта ён яе ж словамі: «Нашто тут мяккі знак, калі гэтыя словы цьвёрда ўсё адно не вымавіш?!»

Покуль я дома біўся, каб растлумачыць, чаму ўсё ж «Ь» не пішацца ў словах «сціхнуў» і «смеласць», а ў словах «пісьменнік» і «штосьці» — пішацца, хоць сам і цяпер шчыра перакананы, што і там ён пісацца мусіць, то непрыемнасьці падкраліся з другога боку, адкуль я іх і не чакаў. У сынавым дзёньніку зьявілася тройка па рускім чытаньні.

— Ты што, чытаць развучыўся? — спытаўся я.

— Чытаю, як чытаў.

— За што ж тады тройка?

— Сказалі, за акцэнт.

— За беларускі?

— За рускі. Я ўсё чытаў, як у іх напісана, усе «о» вымаўляў, усе «ч». Вось за гэта «тры» і паставілі: за «что» і за «хорошо».

Я спачатку хацеў быў пайсьці да настаўніцы сварыцца, а потым перадумаў. Чым вышэй патрабаваньні, тым лепшыя веды. Лепш ведаць на пяць, а мець тры, чым наадварот. А перадумаў я сварыцца, бо прыгадаў іншую школу і тамтэйшыя адзнакі па беларускай мове. Пайшоў я выступаць ад нашага часопіса перад вучнямі ў рускую школу. І, як заўсёды, знайшлася выдатніца, якая ў канцы падзякавала за выступленьне, але заўважыла, што дарма я так перажываю за беларускую мову, маўляў, паўсюль яе вывучаюць, і яе існаваньню нічога не пагражала ды не пагражае. А гаварыла яна гэта ўсё па-руску.

— Выбачай,— спытаў я,— што ў цябе па беларускай мове?

— Пяць,— зьдзівілася яна і дадала, што ў яе па ўсіх прадметах адныя пяцёркі.

— А цяпер падумай,— прапанаваў я,— што табе паставілі б па рускай мове, каб ты не ўмела на ёй размаўляць? Відаць, двойку.

Добра, што беларуская гімназія не стала люстраным адбіткам рускай школы з мінулага, дзе ўсё чужое можна было вучыць абы як. Іншае пытаньне — якую мову лепш праходзіць: польскую, украінскую ці рускую, або ўсе тры разам? Галоўнае — ведаць іх грунтоўна і гаварыць без акцэнту.

І яшчэ адна непрыемнасьць з-за двухмоўя: прыйшоў я забіраць сына пасьля ўрокаў, а ён мне з радасьцю расказвае, як яны пабіліся з «рускімі». Справа ў тым, што сярод трэціх у іх толькі адзіны беларускамоўны клас, астатнія пакуль што рускамоўныя. Вось і падзяляюцца ўсе дзеці на «рускіх» і «беларусаў».

— Вас пабілі, ці вы пабілі? — удакладніў я.

— Прыйшоў завуч і спыніў бойку, але мы ўжо перамагалі.

— А з-за чаго біліся?

— Бо яны — быдлы. Прыйшлі да нас на перапынку ў клас і пачалі зьдзеквацца, казаць: «Беларусы — лапатнікі».

— А ты што?

— Я сказаў: «Пайшлі прэч, сьвіньні расейскія».

— Хіба я цябе такому вучыў? — запярэчыў я і зразумеў, што гэтая фраза прайшла міма, бо сам некалі быў школьнікам, сам яе чуў ад свайго бацькі.

Вядома, пабіцца можна з-за чаго заўгодна: з-за таго, што ты выдатнік, і з-за таго, што двоечнік, што сяброўеш з дзяўчатамі і што не сяброўеш. А ў гэтым выпадку вінаватыя не дзеці, а дарослыя, якія не здатныя зрабіць асобна беларускую і рускую гімназіі, а таму зьвялі іх пад адным дахам. І пачынаюць варагаваць у ёй вучні і настаўнікі, сварацца адныя беларусы з другімі.

Я знарок пераказаў толькі чыста беларускія праблемы, якія ўзьніклі нядаўна і з якімі я ў свой час у школе не сутыкаўся. Ды і што пра іх расказваць — самі ходзіце, мо, у школу, мо, у ліцэй, а мо, у гімназію. А тое, што зьявіліся тыпова нашыя — беларускія — праблемы, то гэта і да лепшага, бо праблемы толькі там, дзе ёсьць рух, там, дзе ідзе жыцьцё. І, шчыра кажучы, у гімназію, дзе вучыцца мой сын, я б хацеў вярнуцца, нават атрымаўшы атэстат. А калі ён не схоча туды завітаць праз восем гадоў, то значыцца — марыць пра яшчэ лепшую, якая мне і не сьнілася, праблемы якой будуць здавацца мне дасягненьнямі.

**Максім КЛІМКОВІЧ**

**УЛАДЗІМІР СЬЦЯПАН**




## РАЗЬДЗЕЛЫ З АПОВЕСЬЦІ

**Малюнкі аўтара**

Пачатак шостага запомніўся...

Есьць такая завядзёнка ў правінцыйных гарадках — адразу пасьля лета пачынаюць рамантаваць розныя трубаправоды. Перакопваюць вуліцы, ставяць агароджы, на якіх целяпаюцца кавалкі чырвонай тканіны, узрываюць асфальт, а па-над глыбокімі канавамі, на дне якіх булькае кіпень і шыпіць пара, робяць хісткія, у дзьве дошкі, масткі. Бывала, што не толькі п'яныя мужчыны, малыя дзеці, сабакі, але і асьцярожныя жанчыны з торбамі ўвальваліся ў гэтыя ямы...

Звычайна рамонт зацягваўся да вясны, і памятаю, як не аднойчы сядзелі мы на ўроках у зімовых палітонах, хукалі на азяблыя пальцы і злосна пазіралі на вялікія, белыя ад шэрані вокны.

Але гісторыя не пра холад і не пра пальчаткі з адрэзанымі пальцамі.

Мікола Баранчык, ці проста — Баран, прыбег у клас і абвясьціў, што побач са школай, за гаражамі, раскапалі вялізную і глыбачэзную канаву і зварваюць трубы.

На перапынку я разам з Міколам ды іншымі бегаў дзівіцца на пранізьлівы агонь, на п'янага зваршчыка, на экскаватаршчыка, а больш на зварачны апарат, бо нас цікавіў карбід.

Мы і раней забаўляліся з ім. Налівалі ў бутэльку крыху вады, пхалі туды сухую траву, а наверх кідалі шэрыя кавалкі карбіду, каб потым добра закаркаваную пляшку разбоўтаць дый кінуць у рачулку ці ў возера. Здаралася, што выбух атрымліваўся даволі моцны, і тады, як вынік, усплывала некалькі аглушаных карасёў. А пра тое, што асколкі могуць параніць, мы не думалі, бо забава з карбідам была амаль бяскрыўдная ў параўнаньні з выбухамі іржавых патронаў, запальных куль, толу ці тэрміту, якія здабывалі пад чыгуначным адхонам.

Пасьля заняткаў, непераапранутыя, мы прыбеглі да канавы. Рабочых не было, відаць, падаліся ў краму. Панура, як рак з адной кляшнёй, стаяў замызганы экскаватар з вялізным замком на дзьвярах кабіны, а на дне ямы, побач з іржавымі тоўстымі трубамі, сярод рознага рыштунку: бруднай ватоўкі, рыдлёвак, рукавіц, скруткаў дроту быў і зварачны апарат.

Мікола Баранчык з Ладакам Тузевічам саскочылі на дно ямы, раскруцілі жалезны балон і зьнесьлі кілаграмаў пяць карбіду. Мы расьпіхалі шэрае сьмярдзючае рэчыва па кішэнях і партфелях, прыхапілі на школьным ганку вядро з ініцыяламі тэхнічкі і хуценька, каб ніхто не згледзеў, рушылі на стары стадыён, палічыўшы, што там — лепшае месца для вялікага выбуху...

Выкапалі ямку, накідалі ў яе карбіду, а толькі тады спахапіліся, што без вады выбуху не будзе. Бегчы па ваду да школы ці ў гаражы не хацелася, ды й карцела як мага хутчэй ірвануць, а таму сталі вакол ямкі і памачыліся. Карбід імгненна зашыпеў і выдыхнуў клуб сьмярдзючай пары.

Ямку накрылі вядром, папярэдне зрабіўшы ў дне колькі дзірак, абклалі, прыціснулі цэглай і пачалі кідаць на перакуленае вядро запалкі. Не шанцавала — вецер гасіў кволыя агеньчыкі, а набліжацца да гурбы мы баяліся. Кіданьне запалак працягвалася хвілін дзесяць, і ўсё дарма.

І вось тады наш спартовец-пераможца школьнага кросу, Мікола Баранчык, сказаў, што мы сікуны, якія нічога не разумеюць у выбухах. Ён





падышоў да вядра за які крок і кінуў запалку зблізку. Зразумела, што запалка весела пыхнула і згасла.

Ладак, я і Сушок пачалі рабіць квач. Мы выдралі колькі лістоў з падручніка, накруцілі на доўгую рэйку і падпалілі, каб здалёк паднесьці да вядра. Пад вядром шыпела, булькала, а вакол яго ўздымаліся і лопаліся каламутныя пухіры...

Мікола не стаў чакаць. Ён вырашыў дадаць да сваёй славы спартоўца яшчэ славу сьмелага, адчайнага хлопца...

Ён схіліўся над вядром, чыркнуў запалку, прыкрыў агеньчык далоньню і паднёс да дзіркі, з якой ірвалася шэрая пара.

Выбух быў нечакана ціхі. Міколу падкінула ў паветра, а астатніх абліло і перапэцкала сьмярдзючай жыжкай.

Хлопец ляжаў на сьпіне і не варушыўся. Яго гожы тварок быў заліты шэрай гразею. Праз колькі імгненьняў Мікола падхапіўся, заскавытаў, закрыў твар далонямі, закруціўся на адным месцы, а праз якую хвіліну паваліўся на бок і страціў прытомнасьць.

Мы так спалохаліся і разгубіліся, што амаль адразу ж кінуліся ўцякаць.

Калі я з Ладакам вярнуўся, то Мікола ўсё яшчэ ляжаў каля ямкі, нерухомы, як нежывы. Вакол яго і на ім шыпелі кавалкі карбіду і грудкі чорнай зямлі. Мы прыўзьнялі хлопца і аднялі яго далоні ад твару. На месцы гожага дробнага тварка быў суцэльны крывавы мешань...


Ані Сушок, ані Віталік не вярнуліся. Разам з Ладакам я пацягнуў Міколу ў бальніцу, палохаючы сустрэчных. Мы перапэцкаліся крывёй так, што ў прыёмным пакоі доктар і санітар не маглі зразумець, каго трэба глядзець і перавязваць першым.

Гадзіну мы праседзелі ў прапахлым хлёркай і лекамі бальнічным калідоры на мулкай канапе, баючыся думаць пра тое, што ж нас чакае.

Не ведаю, адкуль дазналіся Міколавы бацькі пра сына. У аперацыйную іх не пусьцілі, а мы з Ладакам уцячы не пасьпелі.

Міколаў бацька выцягнуў з порткаў скураны пас з матроскай спронжкай, і як мы ні бегалі вакол вялізнага фікуса, як ні выкручваліся — не дапамагло, скураны пас добра-такі пахадзіў па нашых сьпінах.

Але нашыя сьпіны былі ніштo ў параўнаньні са зьнявечаным тварам аднакласьніка...




На забінтаванай галаве бачнымі былі толькі адно вока ды рот з рась-сечанай губою, усё астатняе хавалася пад акрываўленым бінтом. Гэта мы ўбачылі праз шкляныя дзьверы, калі Міколу везьлі на каталцы ў палату.

А калі праз тыдзень зьнялі бінт — я жахнуўся, па сьпіне пабеглі буйныя мурашкі, а ў роце зрабілася кісла і суха. У Міколы быў зламаны нос, расьсечаны лоб, шчокі, брыво, а ў дадатак пакарабачанае вядро выбіла два верхніх зуба. На твары было трынаццаць швоў, а акрамя швоў — мноства чорных, як тыя семкі, жалезных скобак.

Магчыма, той выбух, сатрасеньне мазгоў і прывялі Міколу, адзінага з хлопцаў нашага класа, да залатога медаля, універсітэта, дысертацыі і працы ў сакрэтным інстытуце.

А яшчэ, што тады мяне вельмі зьдзівіла, у сёмым у Міколу закахалася самая прыгожая дзяўчына нашай школы — Тамара Ружанец. Таму каханьню зайздросьцілі ўсе мае аднакласьнікі і аднакласьніцы, а настаўнікі глядзелі на ціхага і зацятага хлопца і высокую, гожую дзяўчынку скрозь пальцы і не чапляліся да іх, не выхоўвалі, як іншых...

З месяц Мікола не хадзіў у школу. Ён сядзеў на балконе другога паверха і сумна сачыў за жыцьцём двара. Заходзіць да яго ў кватэру мне было боязна і сорамна, бо не прайшло яшчэ і не зьнікла пачуцьцё віны за той недарэчны выбух. Хоць і было зразумела, што на месцы Міколы Баранчыка мог быць кожны з нас — вучняў шостага «А».

А за той час, што Мікола Баранчык не зьяўляўся ў школе, адбыліся падзеі, якія абмяркоўвалі з большай цікавасьцю і захапленьнем, чым трагічны выбух на старым стадыёне,— Алесю Пашэку адарвалі вушы...

Не зусім каб адарвалі і іх не было на вялікай галаве, а так: правае амаль цалкам, а левае да паловы.

За які кіламетр ад гарадка, пры шашы, была аднапавярховая закусачная, там гандлявалі віном на разьліў, гарэлкай, цыгарэтамі і рознай ежай: халодным мясам, капустай, яйкамі, таннымі катлетамі, каўбасай... Каля закусачнай доўгай чарадой стаялі машыны, на ганку тоўпіліся і гаманілі вадзіцелі. Побач з машынамі стрыглі вушамі, скублі пыльную траву і жоўтыя кветкі ў палісадніку навязаныя да штакетніку коні.

Вось у гэтую закусачную, з забранымі ў краты вокнамі, вырашылі залезьці Пашэка з Тачылам. Колькі



дзён яны прыглядаліся, прымерваліся, круціліся вакол будынка.

Тачыла, хоць і быў драбнейшы, у закусачную не палез, а стаў на «шухер». Палез цыбаты Алесь.

Спачатку хлопцы адкруцілі іржавую сетку, якая закрывала вентылятар; Тачыла дапамог, Пашэка ўзьлез на скрыні, а потым з дапамогай таварыша праціснуўся між крылаў вентылятара ў кухню — адкуль і трапіў да буфетнай паліцы. Туды Пашэка залез, а вось вылезьці не здолеў...

Той крадзёж быў не першым і не апошнім. Яшчэ леташняй зімою, пад Новы год, Алесь абрабаваў кіёск, у якім месьціўся пункт пракату спартовага рыштунку. З кім ён зрабіў той крадзёж — не ведаю.

А злавілі яго тады проста. Малыя — вучні першых, другіх класаў — расказвалі, што клюшкі, шайбы і спартовыя шапкі ім раздаў Алесь, раздаў проста так і прасіў нікому не расказваць. Зразумела, што куды ж яму трыццаць клюшак, торба шайбаў ды мех аднолькавых, на яго галаву малых, шапак. Праз свой навагодні падарунак ён і папаўся.

Тады ўсё абышлося адносна добра: Алеся пакаралі бацькі, папалохаў турмой дырэктар школы, сьпецшколай папалохала жанчына-міліцыянт, за крадзены рыштунак вылічылі з бацькоўскага заробку...

З закусачнай, праз вентылятар, Алесь выкінуў колькі пачак цукерак з лікёрам, шакаладкі і тры блокі цыгарэт. А калі пачаў вылазіць сам — захрас, не было каму падпіхнуць яго на двор, а Тачыла ўцёк, як толькі згледзеў аўтобус, які заварочваў да закусачнай. Можа, хлопца, які нерухома вытыркаўся са сьцяны, ніхто б і не згледзеў, каб Тачыла не пачаў крычаць, як рэзаны: «Шухер! Шухер! Менты!»

А праз колькі дзён Пашэка, з перавязанай галавой, сядзеў за апошняй партай і ўпэўнена пазіраў на настаўнікаў, не хаваючы позірку.

На перапынку ён паўтараў, кожны раз узбагачаючы сваю гісторыю новымі дэталямі, пра тое, як з ім абышліся ў міліцыі.

Участковы — мажны старшына па прозьвішчы Бурак, завёў перапалоханага падлетка ў маленькі пакойчык без вокнаў. У куце быў адно прышрубаваны да цэментовай падлогі стол і больш ніякай мэблі. Пакуль старшына зачыняў жалезныя дзьверы, Пашэка схаваўся пад той стол, бо здагадаўся, што з ім мусяць рабіць.

На загад вылазіць і ўсё расказаць Алесь яшчэ мацней прыцісnuўся да шурпатай сьцяны і ўчапіўся за ножкі стала.



Раззлаваны старшына схапіў хлопца за каўнер летніка і пачаў цягнуць. Пашэка ўпінаўся як мог, а калі адчуў, што не здолее ўтрымацца — вось-вось каўнер перацісьне горла, ён адчайна выгнуўся і ўпіўся зубамі ў міліцыянтава сьцягно. Алесь укусіў так моцна, што старшына зароў на ўсю міліцыю, закруціўся на адной назе, скурчыўся, адпусьціў хлопцаў каўнер і лаяўся хвілін з дзесяць.

А пасьля таго, як боль крыху суняўся, ён схапіў Пашэку за вушы, выкінуў на сярэдзіну пакоя і адхадзіў гумовай палкай.

Пашэкавы хворыя вушы, і без таго вялізныя і непрыгожыя, зрабіліся як тыя пяльмені, толькі што колерам былі бурачковыя, а праз гэта жахлівыя.

Тачылу Алесь не выдаў, хоць у яго і дапытваліся, з кім ён учыніў крадзёж. Пашэка не выдаў, а зацягнуў Тачылу ў міліцыю яго ж бацька, бо знайшоў у сутарэньнях, калі хадзіў па бульбу, блок цыгарэт і фальгу ад шакаладак.

Тачыла, вядома ж, адмаўляўся, а калі старшына Бурак завёў хлопца ў знакаміты пакой без вокнаў — Тачыла перапалохаўся і ўсё расказаў, відаць, згадаў Пашэку і яго вушы-пяльмені.

Чаму бацька зацягнуў сына ў міліцыю? Цяпер мне думаецца, што мужчына моцна-такі спалохаўся, бо ў гарадку пачалі казаць, што зьнікла з закусачнай каньяку, цукерак, цыгарэт і гарэлкі аж на тры з паловай тысячы, а ў сутарэньнях ён знайшоў толькі адзін блок цыгарэт і фальгу.

А тады ўсе мае аднакласьнікі былі ўпэўнены, што Тачылаў бацька завёў сына ў міліцыю сп'яна.

Алесеў бацька, брыгадзір грузчыкаў, прадаў свой новы матацыкл з люлькай «КА-750», чорны і прыгожы, заплаціў за сына і кінуў сям'ю: сышоў жыць да маці маёй аднакласьніцы — Рымкі Барчук.

Алесь Рымку люта ўзьненавідзеў, пачаў чапляцца да яе і абражаць без дай прычыны, адно што не біў... Яго можна было зразумець, бо нават той, няўстойлівы, сьціплы дабрабыт зьнік, Алесь застаўся з маці і малой сястрой.

Аднойчы, добра гэта памятаю, брыгадзір грузчыкаў прыйшоў у школу, вывеў сына на вуліцу, прыціснуў да сьцяны і сказаў, што заб'е, калі Алесь не кіне чапляцца да яго прыёмнай дачкі — Рымкі.

Праз два гады Алесь Пашэка ўцячэ са сьпецшколы, прыедзе ў гарадок і адпомсьціць бацьку і былой аднакласьніцы Рыме Барчук. Але гэта ўжо новая гісторыя.

## ШЧАСЬЦЕ

*Шчасьце?*
*Яно кожны дзень рознае:*
*Калі кладуся спаць позна я,*
*Калі за вакном пяе салавейка,*
*Калі на вуліцы знойдзеш*
*капейку...*
*Лялькy купіла мне сёньня мама,*
*І гэта вялікае шчасьце таксама.*
*Сэрца ў бабулечкі не баліць —*
*Шчасьце ка мне ўжо на крылах*
*ляціць.*
*А калі дзед вам купляе цукеркі?*
*Гэта не шчасьце? А б'юцца талеркі —*
*Гэта таксама на шчасьце —*
*паверце.*
*Ну а не верыце, дык праверце!*
*Шчасьце? Яно кожны дзень рознае:*
*Калі купляюць вам марожанае,*
*Калі з сабою бяруць у госьці,*
*Калі крыху не хапае чагосьці.*

## Я НЕ ЛЯЛЬКА

*Не, я не лялька, мама, я жывая:*
*Хачу танцую я, хачу сьпяваю,*
*Хачу іграю я, хачу гуляю,*
*Хачу я мару, а хачу — чытаю.*
*Не, я не лялька, дарма суцяшаеш,*
*Ад болю ўсялякага мяне аберагаеш*
*І шчасьця казачнага мне заўжды жадаеш.*
*Не, я не лялька, мама, я жывая.*
*Жыцьцё — не казка. Я даўно ўжо знаю.*
*І ўсё ж яго я з радасьцю вітаю,*
*І ўмею ўжо змагацца я з адчаем.*
*Не, я не лялька, мама, я — жывая!*

**Зоя СІМАГАСЬЦІЦКАЯ,**
**г. Менск,**
**Беларускі ліцэй мастацтваў**

## БЕЛАРУСЬ

*Беларусь ты мая шырокая,*
*Дарагая, блакітнавокая!*
*Як люблю, Беларусь, я цябе.*
*Васількі, завушніцы на вярбе*
*І зялёныя бярозкі,*
*Якім вецер расчэсвае коскі.*
*Чуеш, Радзіма, голас мой?*
*Люблю я цябе ўсёй душой!*

## КРАСАВІК

*Красавік, красавік,*
*Сьнег ужо апошні зьнік.*
*Красавік, красавік,*
*Лётаюць стракозы*
*І спужаліся вясны,*
*Уцяклі марозы.*

**Віта КУРБЕКА,**
**вучаніца 5-га «Б» класа**
**СШ № 16 г. Менска.**



«ДВОР ДЗЕДА ВАСІЛЯ»

Малюнкі Васі ДРАНЬКО-МАЙСЮКА. 6 кл.,
Беларускі ліцэй мастацтваў

«ЛЯ РАКІ ГАРЫНЬ»





# Верхні горад




В•К
12

ЯН БОХАН

# ДВА НАВЕДВАНЬНІ МЕНСКІХ ТЭАТРАЎ

Маё першае наведваньне тэатра зьнітавана са страхам. Было тое ў 1965 годзе, 7 лістапада, на чарговыя ўгодкі Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нас, вучняў-першакласьнікаў, прымалі ў акцябраты. Прыём адбываўся на сцэне Беларускага Дзяржаўнага Тэатра Оперы і Балета, які ў Менску называюць прасьцей — оперны тэатр. Вядома, мы падрыхтавалі выступленьне з песьнямі і вершамі. З месяц я штовечар хадзіў на рэпетыцыі і ведаў вершык выдатна. Пэўна ніколі ў жыцьці я так доўга не буду вучыць і рэпетаваць ніводзін паэтычны твор. Не магу сказаць, што я быў самаўпэўнены першаклясьнік, але і ў баязьліўцы сябе не залічу. Толькі оперны тэатр мяне ўсё ж моцна напалохаў. Я спужаўся бясконцай засцэннай прасторы з яе сцюдзёнымі праймамі, цемрадзю, жалезнымі лесьвіцамі, з пыльнымі анучамі дэкарацыі, ламаччам, бутафорскімі барабанамі і ківерамі... Мяне трэсла ад холаду і страху, хацелася ўцячы дамоў у цёплую кватэру, хацелася залезьці пад ложак, скруціцца ў клубок і заснуць. А на сцэне ў гарачым сьвятле мяне ахапіў іншы страх. Здавалася, што ўсе ў зале бачаць, як дрыжаць і падгінаюцца мае калені. Пэўна ж, я не прамовіў бы ніводнага слова, каб не заплакаў мой аднакласьнік. Ён зарумзаў ціхенька і жаласна. Перапужаная настаўніца спытала, што здарылася, і ён сказаў, што забыўся словы. Хлопца павялі за кулісы. А ў мяне зьявілася радасьць, што не я забыў словы, што не мяне так ганебна пацягнулі прэч. Я адбарабаніў даўжэзны, як для першакласьніка, верш Лермантава «Барадзіно», асабліва гучна я пракрычаў радок, у якім загрымелі барабаны і адступілі басурманы... Мне начапілі на кашулю пяцірогую зорку з залатым Ленінам, і я зрабіўся акцябронкам. Пэўна, страх перад закуліснай прастораю павінен быў зьнікнуць. Але ён не пакінуў мяне, ён вяртаецца ў снах. Прымушае прахопліваццa, ісьці на кухню і піць гарбату, каб супакоіцца і зноў заснуць.

А часам не ў снах, а ў рэальнасьці, калі пачую прозьвішча Крапіва, згадваецца 1971 год і тэатр Янкі Купалы, які ў народзе называюць прасьцей — купалаўскі тэатр. Я ў школьным касьцюме, вучань восьмага класа, прыйшоў на вечарыну Максіма Багдановіча. Я сядзеў на гаўбцы і пазіраў на чырвоны стол прэзыдыума, за якім сабраўся тагачасны гонар беларускай літаратуры. Галовы ганаровых гасьцей былі ў такім ракурсе, што пазнаць каго-небудзь я не мог. Пасьля перапынку я спусьціўся ў залу і сеў на першы рад. Побач селі два жывыя класікі савецкай літаратуры: Кандрат Крапіва і Міхась Лынькоў. Я ўпотай разглядаў выса-

чэзных, як здавалася, сухіх старых дзядоў, што ўвесь час перашэптваліся, пакашлівалі і пасьмейваліся. Іх, пэўна ж, мала цікавіла п'еса Янкі Купалы «Раскіданае гняздо», якая разгарнулася на сцэне. А мяне чамусьці захапіла драма. За купалаўскімі героямі ўбачыліся мае родныя: дзед Уладзімер і баба Броня... Убачыўся падмурак іх новага дому, які зрабілі на грудку, у яблыневым садзе. Убачыўся трактар, які пакрышыў, павывернуў, патрушчыў новы падмурак. Так загадала начальства! Вёска Варакомшчына, дзе жылі мае дзяды і прадзеды, была ў нейкім там сьпісе неперсьпектыўных, і будаваць дамы ў ёй забаранялася. Ну, вядома, калі ты — ганаровы і часам сядзіш у нейкім прэзыдыуме, тады будуйся, а калі просты селянін, тады можна прыехаць на трактары да цябе ў сад і зруйнаваць падмурак новага дому, можна завярнуць плот, можна павыдзіраць яблыні... «Раскіданае гняздо» — адзіная тэатральная пастаноўка, якая па-сапраўднаму ўзрушыла мяне. Чамусьці падумалася, што яе павінны забараніць, што людзі з чырвонастольнага прэзыдыума абавязкова загадаюць не паказваць «Раскіданае гняздо». Не ведаю як, але Крапіву і Лынькова я залічыў у шэрагі тых, хто забараняе.

Дома ў нас хаваліся перапісаныя бацькавай рукою забароненыя вершы Купалы і Коласа, а ў бібліятэцы, дзе працавала мама, былі цэлыя патаемныя паліцы са «шкоднымі», зьнятымі з ужытку кнігамі. Томікі Купалы стаялі на тых паліцах, а вось Крапівы і Лынькова там не было. Але гэта, вядома, не доказ. Для мяне ёсьць іншае, важнае, бачанае... Абыякавасьць, кепікі, жорсткі пракураны сьмех — і Купала, ягоная драма.

І вось цяпер, у 1993 годзе, я задумваюся над пытаньнем... Чаму ў Менску няма тэатраў? Будынкі ёсьць. Залы, крэслы, буфеты, гардэробы, касіркі, дэкарацыі, акторы, рэжысёры, прыбіральні, абкладзеныя мармурам, арфы і скрыпачкі... А тэатра няма. Яго няма як зьявы, як жывога арганізму, які рэагуе на рэчаіснасьць. Ёсьць прыдатак, пратэз, трактар, які выконвае тое, што загадваюць... Вось дазволілі ўзьняць бел-чырвона-белы сьцяг, і яго ўзьнялі. Вось загадалі паверыць у Бога, і ў яго паверылі, ці зрабілі выгляд, што паверылі, як рабілі выгляд, што верылі ў ідэю пабудовы камуністычнага грамадства.

Тэатр не можа без датацыі! А хто плоціць, той і музыку заказвае! Чуў, ведаю і не прымаю, бо правільна казаў вялікі драматург Мікалай Гогаль, што благі той пісьменьнік, які не можа падмануць цэнзара. Гэта па-першае, а па-другое — бачу альтэрнатыву дзяржаўнаму тэатру. На Беларусі яна мела добрую традыцыю. Гэта — батлейка. Не-не, не тую скрынку, што спрабуюць змайстраваць у памяшканьнях з мяккімі фатэлямі... А тую батлейку, што зьяўляецца на кірмашы, тую, што раскажа пра бойку расейца Ельцына з чэчэнам Хазбулатавым, ці пра спрэчку Пазьняка з Булахавым... Батлейка — не дзяржаўны тэатр, яна можа расказаць пра цара Ірада і пра сьмерць Машэрава, пра Біла Клінтана прэзідэнта і пра мужыка Антона, пра Жыда і Венгерца, пра Хусэйна і Хамені... Разумею, страшна стаяць у цемрадзі за сцэнаю, як стаяў Гамлет, калі на сцэне расказвалася пра забойства ягонага бацькі. Пэўна, прынцу дацкаму было ў сто разоў жахлівей, чым мне ў закулісным холадзе опернага тэатра. Але ў Гамлета атрымаўся тэатр, бо адбылася рэакцыя ў зале.

«Ідзі і зрабі сам!» — могуць сказаць мне акторы, грымёры, рэжысёры і крытыкі. І я падумаю, ці скажу што-небудзь накшталт: «Вы мяне не так зразумелі!». Толькі ў тэатры я не хаджу, бо чакаю, калі там зьявіцца існая творчасьць.

# ВУЧЫМ НА ПАМЯЦЬ

МІХАСЬ СТРАЛЬЦОЎ

## БАЛАДА ВУЛІЦЫ

*Я — вуліца,*
*я — рака.*
*Праз водарасьці рэклам*
*плыву ў затокі плошчаў,*
*у рукавы завулкаў —*
*паўз астравы кварталаў*
*і мікрараёнаў*
*мацерыкі.*
*У маіх затоках*
*нерасьцяцца машыны,*
*сьлізка мігцяць бакамі*
*тралейбусы,*
*аўтобусы,*
*трамваі,*
*туга напханыя*
*даволі абрыдлымі мне стварэньнямі,*
*адно на адно падобнымі,*
*бы ў мікрараёне дамы.*
*Праўда, я да ўсяго прывыкла,*
*я стала цярплівая,*
*бо я — вуліца,*
*я — рака.*
*Але калі-нікалі мне хочацца,*
*каб ноч хутчэй наставала,*
*каб хутчэй засыналі машыны —*
*гэтыя юрліва-халодныя Рыбіны,*
*з падманным маторным цяплом.*
*Мне хочацца,*
*каб гарэў толькі бакен,*
*каб гарэла адна тэлевышка,*
*там, у небе, дзе зоры гараць.*
*Толькі і гэта дарэмна!*
*Ноччу я часта чую,*
*як пад бетонным мостам*
*смуткуе мая сястра.*
*Яна шэпча:*
*«О гора мне, гора!*
*Я дзяцей сваіх загубіла,*
*вясёлкавыя ад нафты,*
*усплылі на паверхню яны.*
*Бляшанкамі ад кансерваў*
*дно маё ўсьцяж укрыта,*
*на могільніках бляшанак*
*памяць аб дзецях сьпіць.*
*З маста на мяне з пагардай*
*плююць цыркачы, паэты,*
*грузныя упраўдомы,*
*бухгалтары-планавікі.*
*Бетонныя парапеты*
*мяне абдымкамі душаць,*
*каналізацыйныя трубы*
*пагібель маю пяюць».*
*Так яна шэпча.*
*І ноччу я гэта чую,*
*а днём у затокі плошчаў,*
*у рукавы завулкаў —*
*сваю й сястрыну сумоту*
*нясу,*
*нясу...*

ЛЭСТАР ДЭЛ РЭЙ

# ТУНЭЛЬ ПРАЗ ЧАС

### РАЗЬДЗЕЛ АДЗІНАЦЦАТЫ

## ЖАХЛІВАЯ СЬМЕРЦЬ

І мы пайшлі далей, так упэўнена, быццам толькі што сустрэлі звычайную карову на пашы. Можа, мы ўжо пачыналі прыстасоўвацца да новага асяродзьдзя.

Але раптам мы зразумелі, што не ўсё так проста. Нас акружылі. Мы нічога не бачылі і не чулі: вось толькі што мы былі адны, а праз секунду, прынамсі, мне так падалося, нас акружылі.

Гэта былі людзі.

Людзі.

Яны нічога не гаварылі, толькі стаялі і глядзелі на нас. Яны былі маленькія, цёмна-карычневыя, на некаторых было адзеньне, а на некаторых не. Усяго іх было каля дваццаці.

Узброены яны былі грубымі кіямі і дзідамі. Гэта значыла — яны ведалі, як забіваць.

Але зброю мелі не ўсе. Некаторыя трымалі ў руках галіны з лісьцем.

Варожага ў іх выглядзе нічога не



было, але дружалюбнага таксама. Яны проста стаялі і глядзелі.

Мы таксама стаялі і глядзелі, думаючы, што яны, як гаспадары, зробяць першы крок.

Але яны так не думалі, і я пачаў цікавіцца, ці не прастаім мы тут увесь дзень. Нарэшце док Том сказаў:

— Давайце пойдзем і паглядзім, што здарылася. Ідзіце спакойна і ціха. Не рабіце рухаў, якія яны могуць узяць за варожыя.

Але мне здавалася, што яны нават дыханьне могуць палічыць варожым. Мы зрабілі тры эксперыментальныя крокі наперад: па адным на кожнага з нас. І было вельмі прыемна адчуваць, што нас не працялі дзідамі і не забілі кіямі.

Яны не былі супраць таго, што док гаварыў, таму ён паспрабаваў зноў:

— Яны, здаецца, не супраць нашых рухаў, таму павольна выньце пісталеты. Калі яны нападуць на нас, дык трэба абараняцца.

Мы вынялі «кольты», але першабытных людзей гэта не турбавала. Я думаў, ці спыніць іх тое, што мы заб'ем аднаго-двух, калі яны вырашаць напасьці на нас. Вырашыў, што не. Яны разглядалі нас як падобных да сябе, але іхняя рэакцыя магла быць рэакцыяй дзікай жывёліны. Я не ведаў, прымусіць грукат стрэлаў іх адступіць ці яны кінуцца на нас.

Мы ішлі наперадзе, яны — за намі. Яны маўчалі, і док Том вырашыў паэксперыментаваць. Ён сказаў:

— Мы прыйшлі як сябры.

Ён не думаў, што яны зразумеюць, але хацеў праверыць, як яны адрэагуюць на пытаньне.

Яны ніяк не адрэагавалі.

— Калі мы не будзем зьвяртаць на іх увагу, можа, яны пойдуць?

— Сумніцельна,— адказаў док Том.

— А калі яны ўздымуць дзіды, страляць? — спытаў Піт.

— Давядзецца,— сказаў док.

Але тое, што стрымлівала іх, працягвала дзейнічаць. Мы ішлі наперадзе, яны за намі. Мы спыняліся — яны таксама.

Так мы выйшлі з лесу. Можа, яны вывелі нас. А можа, мы проста ішлі туды, куды трэба было ім. Не ведаю. Прынамсі, калі мы выйшлі з лесу, перад намі было селішча.

Вельмі прымітыўныя хаціны, але яны былі падобныя на тыя, што можна ўбачыць у даведніках па Афрыцы і Аўстраліі: конусы з дахамі з саломы і пальмавага лісьця.

Мы ўсё яшчэ спадзяваліся, што абыдзецца без бойкі. Вядома, нам давядзецца абараняцца, і мы будзем вымушаны карыстацца зброяй. Але мы гэтага не хацелі.

Пасьля таго, як мы выйшлі з лесу і спыніліся, мы зразумелі, чаго ім трэба. Яны пайшлі да селішча, якое было ярдах у пяцідзесяці, але нас ісьці не прымушалі. Мы засталіся на месцы.

З цэнтральнай хаткі выйшаў такі ж маленькі, напалову апрануты чалавек.

Мы маглі чуць іхнюю размову. Мова, хаця і прымітыўная, была МОВАЙ. Яна папаўнялася жэстамі, пантамімай.

Жэсты перакласьці было лёгка. Людзі расказвалі правадыру і астатнім, як яны з вялікай рызыкай злавілі нас. Калі я пераклаў правільна, дык яны ілгалі і не чырванелі. Мы супраціўляліся, але яны перамаглі і прымусілі нас прыйсьці сюды.

— Што вы аб гэтым думаеце? — спытаў док Том.

— У мяне такое пачуцьцё, што яны разглядаюць нас як палонных.

Раптам тлусты лянівец вылез з лесу ярдах у ста і пачаў есьці лісьце з дрэва. Людзі заварушыліся. Жывёліна, безумоўна, была пажаданым падарункам лёсу, сьвятам для селішча. Некаторыя воіны пабеглі да яе. Але правадыр спыніў іх. Ён не адрываў ад нас вачэй і нарэшце вырашыў. Спачатку адна праблема, потым іншая.

Спачатку забіць трох двуногіх, а пасьля ўжо хвастатага.

Дзікуны накіраваліся да нас, і сумненьня ў тым, як яны зьбіраюцца выкарыстаць дзіды і кіі, не было. Мы ўзьнялі стрэльбы.

— Пачакайце,— раптам сказаў док Том.

Ён нацэліўся ў вялізнага ляніўца і стрэліў. Жывёліна нязграбна ўпала на зямлю.

Упэўнены — гук стрэлу не ўразіў дзікуноў. І не магу сказаць, ці зьвязалі яны яго са сьмерцю жывёліны. Але яны спыніліся і зьбянтэжана глядзелі на забітага ляніўца.

Я паглядзеў на правадыра: ён быў такі ж зьбянтэжаны, як і іншыя.

Воіны разглядалі мёртвую жывёліну.

Яны зрабілі некалькі няўпэўненых крокаў, і калі правадыр не спыніў іх, раптоўна пабеглі да жывёліны.

Няцяжка было зразумець, што ў гэтым селішчы кожны змагаўся за сябе. Дзікуны дабеглі да жывёліны і пачалі ірваць яе на кавалкі. Тыя, хто меў дзіды, рэзалі імі, людзі з кіямі прабівалі адтуліны ў целе жывёліны і адзьдзіралі мяса рукамі.

Слабых адпіхвалі ўбок. Тут панавала моц.

— Цудоўныя манеры,— заўважыў док Том.

Я ўсё яшчэ глядзеў на правадыра. Безумоўна, ён быў на галаву вышэй за астатніх, бо заняты быў намі.

— Мы не можам стаяць тут увесь дзень,— сказаў я.— Можа, падыдзем да яго і пагаворым, пакуль ягоная армія занятая?

— Мы заўсёды зможам страляць, калі спатрэбіцца,— дадаў Піт.

Док Том кіўнуў, і мы рушылі наперад. Мы ішлі павольна, быццам мелі ў запасе вечнасьць. Правадыр стаяў на месцы, не рухаючыся.

Калі мы былі ўжо блізка, я сказаў:

— Як маецеся? Вельмі прыемна пазнаёміцца з вамі.

Ён не тое каб згадзіўся з гэтым, але воінаў сваіх клікаць не стаў. Ён глядзеў на стрэльбу, з якой док Том забіў зьвера.

Потым ён прыняў нейкае рашэньне і пайшоў да адной з хацін. Мы ішлі за ім. Ён спыніўся ля ўвахода, павярнуўся да нас і паказаў на дзьверы. Ён ці загадваў нам увайсьці ці запрашаў.

Док Том усьміхнуўся і кіўнуў.

— Зробім так,— сказаў ён, не адрываючы вачэй ад правадыра і стараючыся, каб голас гучаў мякка і прыемна,— сядзем ля ўвахода і паспрабуем здавацца ціхамірнымі.

Мы ўсьміхнуліся правадыру і селі. Ён паглядзеў на нас і задумаўся. Але ў яго былі іншыя справы: патурбавацца аб уласным дабрабыце.

Ён кінуў нас і пайшоў насустрач першаму, хто вяртаўся з мясам. Гэта быў воін з двума вялізнымі кавалкамі.

Правадыр забраў адзін сабе. Воін не пратэставаў. Правадыр стаяў на адным месцы і зьбіраў даніну з кожнага. Хутка яго рукі былі поўныя, і ён пайшоў да хаціны.

— Гэта цікава,— сказаў док Том.— Яны прымаюць ягонае старшынства не з-за грубай моцы, а паважаюць узрост і вопыт.

Можа, так яно і было, але дзікуны, безумоўна, не паважалі жанчын і дзяцей. Калі тыя трапляліся на шляху да мяса, іх білі.

Але яны не пратэставалі. Пакорліва прымалі пабоі і чакалі, пакуль воіны і мужчыны разьбяруць усё, што ім трэба. Потым слабейшыя пайшлі за сваёй часткай.

— Лічу, і нам трэба ўзяць мяса,— сказаў док Том.

— Жывёліна ядомая,— дадаў Піт.— Цікава, яна смачная?

Мяне гэта таксама цікавіла. Калі мы супакоіліся, я зразумеў, што хачу есьці.

— А яго бясьпечна спажываць?

— Зараз дазнаемся,— сказаў док Том і ўстаў.— Прыкройце мяне, але не страляйце, калі не будзе рэальнай небясьпекі.

Ён падышоў да ляніўца, але ніхто не зьвярнуў увагі. Нажом ён адрэзаў колькі добрых кавалкаў. Прынёс іх і сказаў:

— Час вячэраць.

Дзікуны паселі ля хацін і пачалі есьці. Манеры ў іх былі далёка не лепшыя. Яны елі мяса сырым, глыталі амаль не пераржоўваючы.

— Мы таксама будзем есьці сырое мяса? — з сумненьнем спытаўся Піт.

— Не. Мы зробім вогнішча. Упэўнены, яны ведаюць, што такое агонь. Гэта не спалохае іх.

На агонь яны і сапраўды ўвагі не зьвярнулі, але калі мы пачалі сма-



жыць мяса, яны зацікавіліся. Некаторыя нават перасталі есьці. Дзікунам здавалася, што мы псуем мяса.

Амаль усе тут мелі сем'і, але сямейнае жыцьцё не было надта разьвітым. Мужчына сядзеў ля ўвахода і набіваў страўнік, пакуль жонка і дзеці глядзелі галоднымі вачыма. Але ён ім не даваў нічога, пакуль не насычаўся сам. Потым пачынаў кідаць маленькія кавалкі. Калі нейкае дзіця хапала іх надта хутка, яго білі.

Раптам нехта закрычаў, воіны падхапіліся і пабеглі да ляніўца. Мы паглядзелі туды і ўбачылі вакол жывёліны новых людзей.

— Што гэта? — спытаўся Піт.

— Я лічу, захопнікі,— сказаў док Том.— Гэтыя людзі, пэўна, з іншага племені. Спрабуюць скрасьці мяса.

Іншапляменцаў было з дзесятак, і калі іх атакавалі, яны прынялі бой. Але хутка іх перамаглі, і яны пабеглі прэч.

Двое былі паранены. Аднаму кіём перабілі нагу, другі атрымаў дзіду ў жывот.

Дзікі крык трыумфу вырваўся з глотак пераможцаў, і яны пацягнулі двух небаракаў на пляцоўку. Абкружылі іх і пачалі забіваць.

Гэта было дзіка і жахліва. Але шмат часу не заняло. Кожны воін хацеў унесьці сваю долю, і палонныя доўга не пражылі.

Але і пасьля таго, як яны загінулі, білі ўжо мёртвых.

Калі кожны паказаў сваю адвагу, апошнія паднялі трупы і аднесьлі ў лес. Жыцьцё ў селішчы вярнулася да нармальнага стану.


Жудаснае забойства ашаламіла нас. Мяса, якое падсмажыў док Том, выглядала няблага, але Піт сказаў:

— Нешта не хочацца. Апетыт згубіўся.

— Я таксама не хачу,— сказаў я.— Можа, апетыт вернецца раніцай.

— Безумоўна, гэта трагічны выпадак,— сурова сказаў док Том,— але ён зьяўляецца для нас урокам. Тут не дзіцячы садок. Гэтыя людзі — дзікуны.

**Пераклад з ангельскай**
**АЛЕНЫ КУДРАЎЦАВАЙ**



## ВАСІЛЬ ЗУЁНАК

### БОТЫ

*Скараходы-кірзачы,
Ваксаваныя лычы:
Без дарог, па чарнатропе,
Крок наперад — і ў Еўропе,
Крок наперад, два назад —
І ўжо ў Азіі салдат.*

*Разагнаўся, трохі збочыў —
Да Аўстраліі даскочыў.*

*Азірнуўся, павярнуўся —
Раз-два! — і шажком
Да Амерыкі пяшком:
Як па сушы, па вадзе
Ў кірзачах салдат ідзе.
Плёскатам акул пужае,
Сам з сабою разважае:*

*— Можна ў Афрыку падацца,
Толькі трэба разувацца,
Бо ад сонечнай сьпякоты
На нагах згараюць боты...*

*Не зайшоў і ў Антарктыду —
Абмінуў старонкай:
Старшына ў запас не выдаў
Цёплыя валёнкі...*

*Раз-два, тры-чатыры! —
Бліскаюць падкоўкі,—
Кірзачам не прывыкаць
Да маршыроўкі.*

*Крок наперад, два назад,—
Малайчына салдат:
Абышоў зямлю ўсю
І дамоў вярнуўся!*

### ДВА СЯБРЫ

*Два сябры ёсьць у мяне —
Пэндзьлік і Аловак,—
Ні адзін не праміне
Ўдачы адмысловай.*

*Што пабачаць навакол,
Што іх усхвалюе,
Зробяць тут жа двайніком:
Раз! — і намалююць.*

*Жыў на сьвеце мой сусед,
Хоць стары, ды прыткі,—
А цяпер во гэткі ж дзед
Пасяліўся ў сшытку.*

*Шпак, не тоячы тугі,
Паляцеў у вырай,—
Паляцеў, ды ёсьць другі:
На малюнку вырас.*

*Дзе зялёная трава,
Бегаў шэры вожык,
А цяпер іх стала два,—
Хто адрозьніць зможа?!*



*Аж за дзесяць тысяч вёрст*
*Мора б'е прыбоем,—*
*Я дамоў той шум прывёз —*
*У сваім альбоме...*

*Іншым разам — праз вякі*
*Завядуць размову*
*Два сябры-чараўнікі —*
*Пэндзьлік і Аловак.*

*І з сівое даўніны,*
*З памяці нязбытнай*
*Прывядуць да нас яны*
*Вояў старажытных.*

*І ў стагодзьдзях ажывуць*
*Полацак, Гародня,*
*Нашу славу панясуць*
*Яркаю паходняй.*

*А захочам — і на Марс*
*Пракладзём дарогу,—*
*Ніякія сілы нас*
*Супыніць не змогуць!*

*Дзе б ні быў я — паўстае*
*Сьвет у фарбах новых,*
*Бо са мной сябры мае —*
*Пэндзьлік і Аловак!*

**НЕ ЦЯПЕР, ДЫК У ЧАЦЬВЕР...**

*Парабіў бы ўсё даўно,*
*Ды замінкаю адно:*
*Нехта ўсё перашкаджае,*
*Нехта ножку падстаўляе...*

*То забылі тата з мамай*
*На ўвесь дзень задаць праграму,*
*То настаўнік затрымаў,*
*Адарваў ад важных спраў,*
*То: «Які з той працы сэнс?..»,*
*То не раіць экстрасенс...*

*А яшчэ ёсьць дні цяжкія,—*
*Пэўна, знаеце якія:*

*Панядзелак — першы з іх,—*
*Гэта ж ясна: з выхадных*
*У мазгах і ў думках — жмых.*

*У аўторак, як і ўчора,—*
*Галава наўкруг ідзе:*
*«Сплавім справу серадзе...»*

*Серада прайшла — цяпер*
*Спадзяваньні на чацьвер...*

*І ўзьнялася ліхаманка:*
*Нешта піша, пілiць, носіць!..*
*Добра, што прыпомніў з ранку:*
*«Дык жа пятніца на носе,*
*А за ёю выхадныя,*
*Ды й ад працы рукі ныюць...*
*Хай яе затопчуць зладні,—*
*Падналягу на тым тыдні!..»*

*Што ж — выдатнейшы намер —*
*Ёсьць чым апраўдацца:*
*Не цяпер, дык у чацьвер*
*Параблю ўсю працу!*

# ПАСЯБРУЕМ?

Прывітаньне!

Час ад часу ў маёй пошце зьяўляюцца лісты, аўтары якіх хочуць перапісвацца з менскімі хлопчыкамі і дзяўчаткамі. Зрэшты, сталіца заўсёды многім уяўлялася нечым крыху загадкавым, незвычайным, а пасяліцца ў ёй — лічылася справай вельмі прэстыжнай.

Наколькі справядлівыя падобныя меркаваньні, сказаць цяжка, ва ўсякім разе, тут ёсьць шмат як «за», так і «супраць». А вось ці адрозьніваюцца менскія школьнікі ад іншых сваімі захапленьнямі, ва ўсіх жадаючых зараз ёсьць неблагая магчымасьць праверыць. У сёньняшнім выпуску «Пасябруем?» — лісты, якія прыйшлі ў рэдакцыю толькі з Менску. Вось адзін з іх, ад Ані, Алены, Алёшы, Сашы Вазьнюкоў:

«Мы ўсе хочам з кім-небудзь перапісвацца. Ані 14 гадоў. Яна захапляецца музыкай у стылі рэп. А яшчэ яна каратыстка і мае белы пояс каратэ-до. Хоча перапісвацца з хлопцамі і дзяўчатамі яе ўзросту, якія таксама займаюцца каратэ. А ўвогуле не супраць перапісвацца з усімі.

Алене 13 гадоў. Захапляецца танцамі ў стылі рэп і рок-н-рол. Зьбірае паштоўкі, каляндарыкі са здымкамі артыстаў. Любіць розных жывёл: кошак, сабак, коней, трусоў.

Алёшу 12 гадоў. Як і Аня, ён займаецца каратэ-до, праўда, белага пояса пакуль не мае. Зьбірае каляндарыкі і фотаздымкі каратыстаў. Хоча перапісвацца і з хлопцамі і з дзяўчатамі. Абяцае адказаць усім, хоць на тысячу лістоў.

Сашу 10 гадоў. Захапляецца рэпам і рок-н-ролам. Спрабуе пісаць вершы. Іграе на піяніна сем гадоў».

Вось такі ліст. Калі ён вас зацікавіў, пішыце на адрас:

220034, г. Менск, вул. Берасьцянская, 2, кв. 70.



Дарэчы, акрамя ліста я яшчэ атрымаў і фотаздымак, праўда, на ім толькі Аня (зьлева) і Алена. Але, як кажуць, чым багаты, тым і рады.

А Луіза Мароз, якая таксама акрамя ліста даслала мне і свой фотаздымак, захапляецца спартыўнай гімнастыкай, плаваньнем і маляваньнем. Зьбірае ўкладышы ад жвачак, любіць музыку і шмат чытае. А яшчэ яна вельмі часта наведвае царкву, вядома, пакуль са старэйшымі, таму што Луізе ўсяго 8 гадоў.



Яе адрас: 220131, г. Менск, вул. Гамарніка, 26, кв. 139.

А вось што напісала мне Ала Гербік: «Колькі разоў я ні пісала на тыя адрасы, якія ты друкуеш, а мне чамусьці ніхто не адказаў. А я вельмі хачу з кім-небудзь перапісвацца і адкажу ўсім — і хлапчукам і дзяўчаткам. Пра сябе. Люблю чытаць, вязаць, зьбіраю паштоўкі, каляндарыкі, маркі, вельмі люблю жывёл, асабліва сабак.

Школа, у якой я вучуся, з мастацкім дадаткам, таму я вельмі люблю маляваць і малюю добра. Акрамя таго, я яшчэ наведваю і музычную школу. Вучуся на «4» і «5».

Пішыце Але на адрас: 220131, г. Менск, вул. Мірашнічэнкі, 33, кв. 26.

А вось Ксюшы Ражко ўжо 10 гадоў. Яна таксама займаецца плаваньнем, любіць сучасную музыку і зьбірае ўкладышы ад жвачак. А яшчэ яна няблага вышывае.

Сваіх будучых сяброў па перапісцы Ксюша просіць пісаць на адрас:

---



220036, г. Менск, вул. Губарэвіча, 72, кв. 27.

Ірыне Хромавай 14 гадоў. Цікавіцца музыкай, танцамі, любіць жывёл, з вялікай ахвотай займаецца спортам і, як яна піша, калекцыяніруе расьліны і любіць расказваць анекдоты. А яшчэ Ірыне падабаюцца ціхія, спакойныя хлапчукі, але не хлюпікі. Яна чакае лісты ад хлапчукоў і дзяўчатак, якім 14 і болей гадоў.

Адрас Ірыны: 220009, г. Менск, вул. Заслаўская, 35, кв. 89.

Чатырохгадовы Чэслаў, здымак якога я зьмяшчаю ніжэй, ужо спрабуе гаварыць на польскай, ангельскай і нямецкай мовах. Хоча перапісвацца з тымі хлопчыкамі і дзяўчаткамі, якія таксама спрабуюць авалодаць гэтымі мовамі.



Яго адрас: 220114, г. Менск, пр. Ф. Скарыны, 123, корп. 3, кв. 26.

А вось, як мне падалося, вельмі шчыры і шчымлівы ліст. Яго напісаў 19-гадовы Іван Курманаў. «Люблю слухаць сучасную музыку, люблю сабак. Шмат чытаю, пішу вершы на рускай, беларускай і ангельскай мовах.

Цяпер аб тым, што са мной здарылася. Я сустрэў яе месяц назад. Нічога асаблівага ў ёй не было, але яе вочы запомніліся мне на ўсё жыцьцё. Мы сустракаліся каля двух тыдняў, а пасьля вярнуўся яе хлопец. Віка, так яе завуць, адразу забылася пра мяне. Калі мы сустракаемся, яна робіць выгляд, што не заўважае мяне. Я напісаў ёй чатыры лісты, але адказу так і не атрымаў. Хачу забыць яе, але не магу.

Калі ласка, хлопцы і дзяўчаты, напішыце мне аб сваім каханьні і парайце, што рабіць».

Яшчэ Іван даслаў мне свой фотаздымак, але, на жаль, ён вельмі кепскай якасьці.

А адрас Іванаў такі: 220116, г. Менск, вул. Голубева, 13, кв. 292.

**Алесь**

**Комікс намаляваў**
**Віктар ГАГАЛУШКА**















МАРС












Што гэта было?...
...Дзіўна.
к...х...х
пі-пі-пі
...Атрымалася!
...А, нягож, не!
...Наперад!
...Код памятаеш?
...Не хвалюйся.
...Хутчэй!
...Што здарылася?
...Канвой
...на!
...А доўбню прыхопім, яшчэ спатрэбіцца...

# ФОКУС




Пасьля працяглага перапынку ў нашую рэдакцыю зноў завітаў пісьменьнік-дэтэктыўшчык, фокусьнік і чарадзей Фрыдрых Мур. Сустрэла яго нашая карэспандэнтка Алена Каменская.

— Відаць, напісалі новую аповесьць? — Алена адмовілася ад прапанаванай Фрыдрыхам гаванскай цыгары.

— На жаль, не. Занятак камерцыяй не пакідае часу на сур'ёзную літаратуру. Але можаце павіншаваць мяне — я ўжо мільянер.

— Віншую,— сумна сказала Алена,— нам не хацелася б губляць вас як аўтара. Можа, замест абяцаных фокусаў навучыце нашых чытачоў, як стаць мільянерамі?

— На гэта я тут. Фокусы ды камерцыя — адное: як з нічога зрабіць нешта.— Фрыдрых Мур апусьціў руку ў кішэню свайго ўлюбёнага аксамітнага пінжака і выняў калоду навюткіх картаў. Прагартаў, падзяліў напалам, ссунуў, пачаў тасаваць — у спрактыкаваных руках глянцам зьмяіліся карты. Алена адзначыла, што з такім чалавекам садзіцца гуляць за адзін стол небясьпечна — усё адно перагуляе.

— Многія настаўнікі ды бацькі несправядліва лічаць, што ў карты гуляюць адно хуліганы ды двоечнікі,— казаў Фрыдрых пад шоргат картаў,— а я навучыўся ў іх гуляць яшчэ да таго, як пайшоў у школу, і потым ніколі не меў праблемаў з матэматыкаю. У першым класе вусна складаў ды адымаў да тысячы імгненна. Пісаць навучыўся, складаючы картачныя рахункі. Але найлепшымі здабыткамі былі: аналітычнае мысьленьне ды ўменьне стрымліваць эмоцыі. Не ведаючы, адкуль такія здольнасьці, настаўнікі ставілі мяне ў прыклад іншым вучням. Аднак заслужыць павагу аднакласьнікаў добрымі адзнакамі цяжка. Таму без калоды картаў я ў школу не прыходзіў. На перапынках праводзіў бліцтурніры ў покер або паказваў картачныя фокусы. Прыкладам, такі.

Фрыдрых Мур расклаў з картаў чатыры крыжы малюнкамі дагары:

— Запомні адну карту ды пакажы, у якім крыжы яна знаходзіцца.

Алена запомніла віновага туза і паказала крыж, у якім ён ляжаў. Фрыдрых сабраў карты і зноў паклаў чатыры крыжы малюнкамі дагары:

— А цяпер у якім крыжы твая карта?

Алена паказала зноў. Фрыдрых усьміхнуўся, нібыта яна зрабіла недаравальную памылку,ператасаваў карты ды расклаў чатыры крыжы малюнкамі наніз:

— Цяпер пакажы любыя два крыжы.

Алена паказала.

— Адкінем,— Фрыдрых забраў іх.— Пакажы адзін любы крыж.

Алена паказала.

— Пакінем,— Фрыдрых забраў другі крыж.— Цяпер пакажы дзьве карты. Так, іх забіраем. Пакажы адну карту. Добра, яе таксама забіраем.

На стале засталася ляжаць адна карта. Фрыдрых падсунуў яе да Алены:

— Падымі. Твая.

Перад ёю лёг вінові туз — гэтую карту яна задумала на самым пачатку.

— Як вы змаглі здагадацца?

— Ты ж сама паказала крыжы,— разьвёў рукамі фокусьнік.— А цяпер яшчэ адзін фокус. Тлумачэньні потым.

Фрыдрых узяў у рукі дзесяць картаў і расклаў іх на стале малюнкамі наніз.

— Пакажы мне, дзе, на тваю думку, ляжыць хрыстовы кароль? Пакажы, але карту не падымай.

Алена наўздагад паказала першую лепшую карту. Фрыдрых узяў яе, але Алене не паказаў:

— А дзе, на тваю думку, ляжыць віновая дама?

Алена паказала зноў. Фрыдрых Мур узяў і яе, ды ўсё так жа ж, хаваючыся, сказаў:

— А чырвовы туз я бяру сам.

Потым паклаў на стол усе тры карты, якія трымаў у руках: хрыстовы кароль, віновая дама, чырвовы туз.

— А цяпер глядзі ўважліва, я тлумачу, як робяцца гэтыя фокусы.

## ФОКУС З КРЫЖАМІ

Адбіраю з калоды шаснаццаць картаў: тузы, каралі, дамы ды валеты, раскладаю іх крыжамі па чатыры карты ў кожным малюнкамі дагары, парадак раскладаньня пакуль што не мае значэньня, потым кажу чароўную фразу: «Задумай карту ды пакажы крыж, у якім яна знаходзіцца». Ты задумала віновага туза і паказала крыж, у якім ён ляжыць. Покуль я нясьпешна зьбіраю астатнія крыжы, то пасьпяваю запомніць чатыры карты, сярод якіх ляжыць твая. Цяпер я зноў раскладаю крыжы малюнкамі дагары, але цяпер у кожны з чатырох крыжоў мусіць трапіць па адной карце з крыжа, у якім ляжала твая карта. Ты паказваеш, і я ўжо ведаю напэўна, што ты задумала віновага туза! Іншых жа картаў з папярэдняга крыжа там няма. Я магу адразу падняць гэтага туза ды паказаць табе, але ты здагадаесься, як я дазнаўся пра яго, таму мушу цябе яшчэ заблытаць.

Зноў зьбіраю карты, незаўважна кладу пад калоду твой туз. Раскладваю крыжы малюнкамі наніз. Апошнім кладзецца віновы туз. Вось ён, але ты пра гэта не ведаеш. Цяпер прашу паказаць два крыжы. Ты паказала, я кажу: «Іх пакідаем»,— іншыя забіраю.

— Я ж магла паказаць і гэтыя два,— зьдзівілася Алена.

— Тады б я сказаў: «Іх забіраем»,— але пакінуў бы ўсё адно тыя, што патрэбны мне. Ты паказвай, што хочаш, але я забіраць буду так, каб на стале заставаўся віновы туз. Галоўнае — правільна казаць «забіраю» або «пакідаю» і рабіць усё хутка. З першага разу ты не пасьпееш заўважыць, што я раблю.

## ФОКУС «ПАКАЖЫ КАРТУ»

Бяру каля дзесяці картаў і калі іх тасую, то незаўважна падглядаю, якая карта ляжыць унізе — лепш за ўсё зьлёгку перагнуць калоду. У нашым выпадку гэта быў хрыстовы кароль. Раскладаю перад табой карты малюнкамі наніз і прашу паказаць, дзе, на тваю думку, ляжыць менавіта гэты хрыстовы кароль. Ты паказваеш, я падымаю, бачу, што гэта віновая дама: «А дзе ляжыць віновая дама?» Ты паказваеш, я бяру — гэта чырвовы туз. Тады кажу: «Чырвовы туз я вазьму сам»,— і бяру, як ты здагадалася, хрыстовага караля. Усе тры названыя карты ў мяне на руках, і я па адной кладу іх на стол: хрыстовы кароль, віновая дама, чырвовы туз. Атрымалася, што ты ўсё паказала сама.


Тут у Фрыдрыхавым дыпламаце зазваніў партатыўны радыётэлефон. Камерсант хутка паразумеўся. А на разьвітаньне сказаў:

— У бізьнесе, як і ў картах, галоўнае — хуткасьць.

А сваю калоду картаў ён забыўся на рэдакцыйным стале. Ці, мо, падкінуў?

АЛЕНА КЛІМЕНКА

# МАЛЕНЬКІЯ ГІСТОРЫІ ПРА СЛАЎКУ



Слаўкава маці зьвязала сабе на прутках новы чырвоны каптурык і зьбіраецца выйсьці ў ім на вуліцу.

— Асьцярожней, мамачка,— асьцерагае яе Слаўка,— калі будзеш ісьці каля лесу, надзень на галаву торбу, бо як толькі ваўкі згледзяць чырвоны каптурык, то і цябе разам з ім праглынуць.

*

На выставе Слаўка ўсё баяўся падысьці да чучалаў дзікіх зьвяроў, але раптам састроіў страшны твар, падбег да іх і крыкнуў:

— Што, утрупянелі ад жаху?! Вам зараз і варушыцца боязна!

*

У парку Слаўка ўзьлез з нагамі на лаўку і не разумее, чаму маці зрабіла яму заўвагу:

— Галубы таксама на лаўцы з нагамі сядзяць, але ж ты на іх не сварысься?

*

Слаўка ўпершыню наведаў оперны тэатр. Першы акт хлопчык сядзеў ціха, аднак пасьля антракту пачаў насьвістваць.

— Цішэй ты! — азірнуліся на яго.— Не ў лесе ж знаходзісься!

— Яны таксама не ў лесе,— паказаў Слаўка на сцэну.

*

Слаўкава маці надзела новую сінюю сукенку і пайшла забіраць сына са школы, але хлопчык гуляў і не зьвяртаў увагі на тое, што маці кліча яго.

— Чаму ты сам не падышоў да мяне? — спытала маці ў Слаўкі, калі ўзяла яго за каўнер.

— Ой, мамачка! — зьдзівіўся Слаўка,— а я падумаў, што гэта наша прыбіральшчыца ў сінім халаце ідзе падлогу мыць!



Бярозка

КРАСАВІК
№ 4 1993

Выдаецца са сьнежня 1924 года
Штомесячны часопіс для падлеткаў
Заснавальнік: Журналісцкі калектыў рэдакцыі

Галоўны рэдактар
Вячаслаў АДАМЧЫК.

Рэдакцыя і рэдакцыйная калегія:
Алесь БАДАК,
Лявон БАРШЧЭЎСКІ,
Артур ВОЛЬСКІ,
Адам ГЛОБУС,
Сяргей ЗАЙЦАЎ,
Людміла КАНАШАНКАВА,
Максім КЛІМКОВІЧ (адказны сакратар),
Валянцін ЛУКША,
Уладзімір САВІЧ,
Уладзімір СІЎЧЫКАЎ,
Натальля СМАЛЯКОВА,
Міраслаў ШАЙБАК.

Мастацкі рэдактар
Уладзімір СКРЫГАНАЎ.

Тэхнічны рэдактар
Ніна Гарбар.

Карэктар
Галіна Уласава.

Адрас рэдакцыі:
220041,
Менск,
прасьпект Францыска Скарыны, 79.
Тэлефоны:
32-94-66, 32-75-01, 32-91-78.

Здадзена ў набор 29.01.93.
Падпісана да друку 5.04.93.
Фармат $60 \times 84^{1}/_{8}$.
Папера друкарская № 2.
Гарнітуры школьная, часопісная рубленая.
Афсэтны друк.
Умоўн. фарбаадб. 14,5.
Умоўн. друк. арк. 4.
Ул.-выд. арк. 4,75.
Тыраж 11 770 экзэмпляраў.
Заказ 55.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Менск,
прасьпект Францыска Скарыны, 79.

Ад аўтараў (за выключэньнем юнкораў) матэр'ялы прымаюцца ў двух экзэмплярах, надрукаваныя на машынцы праз два інтэрвалы.





Оля РЫМКЕВІЧ, 8 гадоў.
Адрас: 211060, Віцебская вобл., Гомельскі р-н, г. п. Коханава, м-ён, д. 15а, кв. 62.

Каця РАБАВА, 9 гадоў.
Адрас: 222120, Менская вобл., г. Барысаў, пр. Рэвалюцыі, 30, кв. 3.

Дзіна ЖУКОЎСКАЯ, 13 гадоў.
Адрас: 220141, г. Менск, вул. Русіянава, 32, корп. 2, кв. 117.

Віта КУРБЕКА, 12 гадоў.
Адрас: 220079, г. Менск, вул. Апанскага, 56, корп. 1, кв. 34.







НУМАР АФОРМЛЕНЫ СЛАЙДАМІ ІВАНА БЯЛЯЕВА

ISSN 0320—7579. «Бярозка», № 4, 1993. 1—36. Індэкс 74822. Цана ў розніцу 6 руб.